ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык сектара культуры
Іўеўскага райвыканкама
С.В.Кішкель

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб раённым аглядзе-конкурсе
аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах
"Свет захапленняў"

1.Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага агляду-конкурса (далей – Агляд-конкурс) аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах "Свет захапленняў".

2. Мэтамі і задачамі Агляду-конкурсу з'яўляецца выяўленне новых сучасных форм работы з моладдзю, вызначэнне шляхоў развіцця аматарскага руху, далучэнне насельніцтва да каштоўнасцей беларускай культуры, актывізацыя работы па духоўна-маральным, грамадзянска-патрыятычным і эстэтычным выхаванні дзяцей, падлеткаў і моладзі; садзейнічанне стварэнню новых аб'яднанняў, пашырэнню форм дасугавай дзейнасці, абагульненне існуючага вопыту, яго абагульненню існуючага вопыту, яго прапаганда і ўкараненне ў практыку клубнай работы.

3. Арганізатарамі Агляду-конкурсу з'яўляюцца: сектар культуры Іўеўскага райвыканкама; дзяржаўная ўстанова культуры "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу".

4. Агляд-конкурс праводзіцца 1раз у 2 гады.

5. У Аглядзе-конкурсе прымаюць удзел дзіцячыя, моладзевыя аматарскія аб'яднанні, клубы маладой сям'і дзеючыя на базе аддзелаў і філіялаў ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу".

6. Агляд-конкурс адбудзецца ў два этапы: 1 этап - раённы адборачны агляд, 2 этап – абласны агляд .

7. Першы тур - праводзіцца на працягу сакавіка 2025 года на базе аддзелаў і філіялаў ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу" (згодна графіка) з мэтай вылучэння лепшых аматарскіх аб'яднанняў для ўдзелу ў 2 абласным этапе агляда-конкурса.

8. Другі тур – абласны агляд-конкурс пройдзе ў красавіку 2025 года. У абласным аглядзе-конкурсе прымуць удзел **1-3** лепшыя аматарскія аб'яднанні – пераможцы раённага этапа.

9. Да агляду-конкурсу неабходна падрыхтаваць відэаверсію пасяджэння, якое найбольш яскрава адлюстроўвае накірунак яго дзейнасці; статут